# Добрая ініцыятыва

Добрую ініцыятыву праявілі работнікі Салігорскай гарадской бібліятэкі. Яны арганізавалі правядзенне канферэнцый чытачоў непасрэдна ў чырвоных кутках інтэрнатаў, дзе жывуць маладыя шахцёры і будаўнікі.

Нядаўна такая канферэнцыя адбылася ў інтэрнаце № 13. Чытачы абмеркавалі кнігу А. Андрэева «Рассудзіце нас людзі». У сваіх выступленнях рабочыя калійнага камбіната Іван Філіпаў, Іосіф Ігнаценка і іншыя гаварылі аб станоўчых і адмоўных рысах герояў рамана, дзяліліся думкамі аб тым, якім яны ўяўляюць сабе чалавека камуністычнага грамадства.

Канферэнцыя прайшла жыва і цікава.

**І. АБАБУРКА.**

г. Салігорск.